ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
29.07.2025 № 133

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» для I–III класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» (далей – вучэбная праграма) прызначана для I–III класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання. Змест вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі комплексна прадстаўлены трыма ўзаемазвязанымі адукацыйнымі кампанентамі: «Прырода і чалавек» (вядучы кампанент), «Чалавек і яго здароўе», «Чалавек і грамадства».

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 99 гадзін, з іх 30 гадзін у I класе (1 гадзіна ў тыдзень пасля завяршэння модулю «Уводзіны ў школьнае жыццё»), 34 гадзіны ў II класе і 35 гадзін у III класе.

3. Мэта навучання прадмету «Чалавек і свет» – развіццё асобы навучэнца ў працэсе пазнання і ўзаемадзеяння з навакольным асяроддзем на аснове выкарыстання засвоеных ведаў, сфарміраваных уменняў і навыкаў экалагічных і духоўна-маральных, эмацыйна-каштоўнасных адносін.

4. Асноўнымі задачамі навучання вучэбнаму прадмету«Чалавек і свет» з'яўляюцца:

фарміраванне ўяўленняў аб аб'ектах прыроды і з'явах, іх разнастайнасці, адзінстве прыроднага і сацыяльнага, аб месцы чалавека ў прыродзе і грамадстве;

фарміраванне ўменняў, неабходных для экалагічна ўсвядомленага ўзаемадзеяння з навакольным светам (устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж аб'ектамі і з'явамі прыроды, паміж дзеяннямі чалавека і прыродай, выконваць правілы прыродаахоўных паводзін, пасільную прыродаахоўную дзейнасць, ажыццяўляць усвядомлены выбар (дзеянняў, учынкаў) у дачыненні да прыроды і адказваць за свой выбар);

набыццё вопыту беражлівых адносін да прыроды, гуманных адносін да ўсяго жывога, што з'яўляецца асновай экалагічнай культуры навучэнцаў;

стварэнне ўмоў для авалодання навучэнцамі элементарнымі метадамі пазнання прыроды (назіранне, эксперымент) і здольнасці іх выкарыстоўваць для атрымання новых ведаў аб прыродзе, праверкі іх дакладнасці, рашэння практычных задач;

засваенне ведаў аб арганізме чалавека, кампанентах здаровага ладу жыцця і спосабах яго рэалізацыі, развіццё здольнасці выкарыстоўваць іх для рашэння практычных задач здароўезахавання;

пашырэнне ведаў аб нормах і правілах культурападобных паводзін у сацыяльным асяроддзі, вопыту маральна-этычных адносін да людзей;

фарміраванне паважлівых адносін да сям'і, да сваёй малой радзімы, да краіны, яе гісторыі, культуры, прыроды; пачуцця гордасці за яе дасягненні, а таксама патрэбы ўдзельнічаць у пасільнай дзейнасці на карысць сваёй краіны і грамадства;

садзейнічанне развіццю ўменняў працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, прадуктыўнай камунікацыі і супрацоўніцтва, лагічнага, крэатыўнага і крытычнага мыслення, арганізацыйна-рэгулятыўных уменняў (прымаць вучэбную задачу і прытрымлівацца яе ў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, ажыццяўляць планаванне дзейнасці, яе кантроль, карэкцыю і ацэнку).

5. Формы і метады навучання і выхавання.

Формы арганізацыі навучання вучэбнаму прадмету«Чалавек і свет» – урок, экскурсія, мэтавая прагулка. Арганізацыя вучэбных заняткаў па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» прадугледжвае франтальную, індывідуальную, парную, групавую і калектыўную формы работы, іх аптымальнае спалучэнне.

Метады навучання абумоўлены спецыфікай мэтавых установак і зместу вучэбнага прадмета. Асаблівае значэнне маюць эўрыстычныя гутаркі, рашэнне сітуацыйных задач, экалагічнае прагназіраванне, мадэліраванне, назіранне ў прыродзе, вопыты, дыдактычныя гульні. Праца з вучэбным дапаможнікам не толькі з'яўляецца крыніцай новых ведаў, але і служыць сродкам замацавання вывучанага, фарміравання вучэбна-пазнавальных кампетэнцый (інтэлектуальных, інфармацыйных).

Экскурсіі і мэтавыя прагулкі з'яўляюцца асноўнымі формамі непасрэднага вывучэння навакольнага свету ў працэсе назіранняў, а таксама набыцця вопыту прыродаахоўных паводзін і элементарнай практычнай прыродаахоўнай дзейнасці. Мэтавыя прагулкі прадугледжаны перш за ўсё для сезонных назіранняў у прыродзе ў І класе.

6. Чаканыя вынікі засваення дадзенай вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет»:

6.1. асобасныя:

праяўленне цікавасці да вывучэння прыроды, грамадскіх з'яў, культуры, эканомікі, гісторыі сваёй краіны; усведамленне каштоўнасці, цэласнасці і разнастайнасці навакольнага свету, свайго месца ў ім;

усведамленне значэння навуковых ведаў аб прыродзе для захавання ўмоў, прыдатных для жыцця ўсяго жывога на Зямлі, развіцця грамадства, захавання і ўмацавання здароўя чалавека, забеспячэння бяспекі і дабрабыту яго жыцця і дзейнасці;

запатрабаванне ў беражлівым стаўленні да ўсіх аб’ектаў навакольнага асяроддзя, гуманным стаўленні да ўсяго жывога;

усведамленне пачуцця любові да сваёй краіны, гордасці за яе, паважлівыя адносіны да яе культуры, людзей;

6.2. метапрадметныя:

развіццё лагічных уменняў (параўнанне аб’ектаў і вылучэнне ў іх асноўных агульных і адметных прыкмет, класіфікацыя аб’ектаў па ўказаных прыкметах, тлумачэнне і ўстанаўленне прычынна-выніковых сувязяў, пабудова высноў, фармуляванне высноў і ацэначных меркаванняў);

авалоданне элементарнымі метадамі пазнання аб’ектаў і з’яў навакольнай рэчаіснасці – назіраннем, вопытам, эксперыментам;

развіццё ўменняў працаваць з інфармацыяй: выкарыстоўваць тэкст, ілюстрацыі, геаграфічныя карты, іншыя крыніцы для атрымання неабходнай інфармацыі; вылучаць галоўнае ў змесце вучэбнага матэрыялу, інтэрпрэтаваць, крытычна ацэньваць, інтэграваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц;

развіццё камунікатыўных уменняў: будаваць маналагічную і дыялагічную мову, канструяваць пісьмовыя і вусныя выказванні ў адпаведнасці з граматычнымі і сінтаксічнымі нормамі мовы; выказваць сваё меркаванне, дамаўляцца, удзельнічаць у сумесным прыняцці рашэнняў, у стварэнні калектыўнага або агульнага адукацыйнага прадукта, праяўляць чуласць, спагадлівасць, аказваць дапамогу, падтрымку партнёрам па зносінах і супрацоўніцтву;

развіццё рэгулятыўных уменняў: усведамляць, прымаць, фармуляваць і ўтрымліваць мэты і задачы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці; планаваць, арганізоўваць, ажыццяўляць самакантроль, самаацэнку, рэфлексію вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ў працэсе індывідуальнай і сумеснай работы;

6.3. прадметныя вынікі навучання ўяўляюць сабой абавязковы мінімум ведаў і ўменняў, прадугледжаных зместам дадзенай вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» за перыяд навучання ў I–III класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай і беларускай мовамі навучання і выхавання.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў I КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Страціла сілу з 01.09.2026 года.

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў II КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(1 гадзіна ў тыдзень, усяго 34 гадзіны)

### АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК» (26 гадзін)

### ПРЫРОДА ВАКОЛ НАС (1 гадзіна)

Прырода жывая і нежывая. Адметныя прыкметы аб’ектаў жывой і нежывой прыроды. Чалавек – частка жывой прыроды. Сувязь жывой і нежывой прыроды. Сувязь паміж раслінамі і жывёламі. Значэнне прыроды ў жыцці чалавека.

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту. Праца з ілюстрацыямі: апісанне, аналіз (устанаўленне і тлумачэнне прычынна-выніковых сувязей, устанаўленне адпаведнасці малюнка з тэкстам), параўнанне; складанне апавядання пра сувязі ў прыродзе з апорай на ілюстрацыі. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых высноў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і малюнка з наяўным пачуццёвым вопытам.

Фіксацыя атрыманых вынікаў назіранняў у тэкставай форме (выступленне, выказванне) і графічным выглядзе (малюнак, схема).

### НЕЖЫВАЯ ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК (6 гадзін)

#### Паветра і яго ўласцівасці

Паветра вакол нас. Уласцівасці паветра: бясколернае, празрыстае, не мае паху, дрэнна праводзіць цяпло, добра прапускае сонечныя прамяні.

### Значэнне і ахова паветра

Значэнне паветра для жыцця раслін, жывёл і чалавека. Роля раслін у падтрыманні чысціні паветра. Крыніцы забруджвання паветра і меры па яго ахове. Чыстае паветра – залог здароўя чалавека. Неабходнасць праветрывання памяшканняў.

### Вада і яе ўласцівасці

Вада ў прыродзе. Уласцівасці вады: бясколерная, празрыстая, цякучая, не мае смаку і паху. Вада – растваральнік некаторых рэчываў.

### Значэнне і ахова вады

Значэнне вады для жыцця раслін, жывёл і чалавека. Вада і здароўе чалавека. Пітная вада. Эканомія вады. Крыніцы забруджвання і меры па ахове вады.

### Глеба

Глеба. Урадлівасць глебы. Склад глебы: пясок, гліна, паветра, вада, перагной.

### Значэнне глебы і клопат пра яе

Значэнне глебы для раслін, жывёл і ў жыцці чалавека. Насельнікі глебы. Іх роля ў павышэнні ўрадлівасці глебы. Клопат чалавека аб захаванні і павышэнні ўрадлівасці глебы. Роля раслін у абароне глебы ад разбурэння.

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту. Праца з ілюстрацыямі: апісанне, аналіз (устанаўленне і тлумачэнне прычынна-выніковых сувязей, устанаўленне адпаведнасці малюнка з тэкстам), параўнанне. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых высноў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і малюнка з наяўным пачуццёвым досведам. Рашэнне вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроку інфармацыі (ацэньванне або выбар варыянтаў паводзін у прыродзе з пазіцыі прыродаахоўных паводзін, прагназіраванне развіцця сітуацыі).

Складанне апавяданняў аб значэнні паветра ў жыцці чалавека, аб тым, як чалавек выкарыстоўвае ваду, з апорай на ілюстрацыі, тэкст вучэбнага дапаможніка, свае назіранні.

Вопыт практычнай дзейнасці. Правядзенне элементарных доследаў, выяўленне доследным шляхам уласцівасцей паветра, вады, саставу глебы. Назіранне за дэманстрацыйнымі доследамі, якія праводзяцца педагагічным работнікам. Фіксацыя атрыманых вынікаў і назіранняў у тэкставай форме (выступленне, выказванне) і графічным выглядзе (малюнак, схема).

Выкананне заданняў на мадэліраванне сувязей паміж нежывой прыродай і чалавекам (станоўчага і адмоўнага ўздзеяння людзей на нежывую прыроду).

## ЖЫВАЯ ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК (19 гадзін)

### Расліны – частка жывой прыроды

Разнастайнасць раслін. Дрэвы, кусты, травяністыя расліны, іх адметныя прыкметы. Часткі расліны (на прыкладзе кветкавага). Іх значэнне для расліны.

### Умовы, неабходныя для росту і развіцці раслін

Рост, развіццё і прарастанне раслін. Умовы, неабходныя для жыццядзейнасці раслін.

### Дзікарослыя дрэвы

Лісцяныя і хваёвыя дрэвы Беларусі. Іх роля ў прыродзе і значэнне ў жыцці чалавека.

### Дзікарослыя хмызнякі

Дзікарослыя хмызнякі, найбольш распаўсюджаныя ў Беларусі. Іх роля ў прыродзе і значэнне ў жыцці чалавека.

### Лекавыя расліны Беларусі

Лекавыя дрэвы, хмызнякі, травяністыя расліны. Іх значэнне ў жыцці чалавека.

### Атрутныя расліны Беларусі

Атрутныя расліны, найбольш распаўсюджаныя ў Беларусі. Іх адметныя прыкметы. Меры бяспекі пры сустрэчы з атрутнымі раслінамі.

### Ахова раслін

Правілы прыродаахоўных паводзін у адносінах да раслін. Расліны Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь.

## Культурныя расліны Беларусі

Агароднінныя, пладовыя, збожжавыя расліны. Іх значэнне для чалавека.

## Дэкаратыўныя расліны

Разнастайнасць і прыгажосць дэкаратыўных раслін. Іх значэнне ў жыцці чалавека. Пакаёвыя расліны, правілы догляду за імі. Расліны ў доме чалавека. Іх уплыў на здароўе чалавека.

## Грыбы

Разнастайнасць грыбоў. Ядомыя і ядавітыя грыбы. Правілы збору грыбоў. Роля грыбоў у прыродзе і іх значэнне ў жыцці чалавека.

## Разнастайнасць жывёл. Насякомыя

Разнастайнасць жывёл. Іх адметныя прыкметы. Насякомыя. Іх адметныя прыкметы. Траваедныя, драпежныя, усёедныя насякомыя. Роля насякомых у прыродзе.

## Рыбы

Разнастайнасць рыб. Іх адметныя прыкметы. Прыстасаванні рыб да воднага асяроддзя пасялення. Траваедныя, драпежныя, усёедныя рыбы. Іх роля ў прыродзе.

## Земнаводныя (амфібіі)

Разнастайнасць земнаводных. Іх адметныя прыкметы. Прыстасаванні земнаводных да жыцця ў вадзе і на сушы. Земнаводныя – драпежныя жывёлы. Роля земнаводных у прыродзе.

## Паўзуны (рэптыліі)

Разнастайнасць паўзуноў. Іх адметныя прыкметы. Драпежныя і ўсёедныя паўзуны. Роля паўзуноў у прыродзе.

## Птушкі

Разнастайнасць птушак. Іх адметныя прыкметы. Траваедныя, драпежныя, усёедныя птушкі. Роля птушак у прыродзе і іх значэнне ў жыцці чалавека.

## Млекакормячыя (звяры)

Разнастайнасць звяроў. Адметныя прыкметы млекакормячых і іх прыстасаванні да ўмоў жыцця. Траваедныя, драпежныя, усёедныя млекакормячыя. Роля звяроў у прыродзе.

## Значэнне свойскіх і дзікіх жывёл у жыцці чалавека

Свойскія млекакормячыя, птушкі, рыбы, насякомыя. Гаспадарчае, эстэтычнае, навуковае значэнне свойскіх і дзікіх жывёл.

Ахова жывёл

Уплыў гаспадарчай дзейнасці на колькасць дзікіх жывёл.

Правілы прыродаахоўных паводзін у адносінах да жывёл. Клопат чалавека аб жывёлах у перыяд з’яўлення нашчадства. Рэдкія і знікаючыя жывёлы роднага краю. Жывёлы Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь.

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту. Праца з ілюстрацыямі: апісанне, аналіз (вызначэнне адметных прыкмет раслін, асаблівасцей будовы знешняга выгляду жывёл і іх тлумачэнне ў сувязі з месцам пражывання, ладам жыцця і харчавання), параўнанне; устанаўленне адпаведнасці малюнка з тэкстам. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых высноў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і малюнка з наяўным пачуццёвым вопытам. Рашэнне вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроку інфармацыі (ацэньванне або выбар варыянтаў паводзін у прыродзе з пазіцыі прыродаахоўных паводзін, прагназіраванне развіцця сітуацыі, фармуляванне правіл паводзін).

Складанне аповеду аб значэнні дзікарослых дрэў у жыцці чалавека; апісанне атрутных і пакаёвых раслін, грыбоў з апорай на тэкст, ілюстрацыі вучэбнага дапаможніка, наяўны пачуццёвы і практычны вопыт. Апісанне пакаёвых раслін па плане. Складанне аповедаў-загадак аб птушках і млекакормячых роднага краю.

Экскурсія «Дзікарослыя расліны Беларусі»

Вопыт практычнай дзейнасці. Знаходжанне частак раслін. Распазнанне дзікарослых раслін (дрэваў, кустоў, травяністых раслін). Распазнанне і апісанне (вусна) культурных і дзікарослых раслін, пакаёвых раслін з выкарыстаннем натуральных аб’ектаў, гербарных узораў. Пасадка пакаёвых раслін і догляд за імі. Захаванне правілаў прыродаахоўных паводзін у адносінах да раслін.

Назіранне за дэманстрацыйнымі доследамі, якія праводзяцца педагагічным работнікам: выяўленне ўмоў росту і развіцця раслін, перамяшчэнне вады па сцябле ад кораня да лісця, увільгатненне паветра лісцем раслін.

Распазнанне жывёл па адметных прыкметах, апісанне знешняга выгляду 1–2 прадстаўнікоў розных груп жывёл. Назіранні за акварыумнымі рыбкамі, птушкамі, аказанне дапамогі зімуючым птушкам (узімку і ранняй вясной): развешванне, запаўненне, чыстка кармушак.

Збор насення пустазельных раслін для падкорму птушак (падчас экскурсіі на прыроду). Захаванне правілаў прыродаахоўных паводзін у адносінах да жывёл.

Назіранне за пакаёвымі раслінамі школы і пазнаванне іх па натуральных узорах.

Мадэліраванне сувязей паміж раслінамі і жывёламі, паміж жывёламі.

Фіксацыя атрыманых вынікаў назіранняў у тэкставай форме (выступленне, выказванне) і графічным выглядзе (малюнак, схема).

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ» (3 гадзіны)

### ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ (3 гадзіны)

#### Клопат чалавека аб здароўі

Значэнне здароўя ў жыцці чалавека. Спосабы захавання і ўмацавання здароўя чалавека. Рэжым дня, важнасць яго захавання. Чаргаванне працы і адпачынку ў рэжыме дня. Гігіена вучэбнай працы пры выкананні дамашніх заданняў. Захаванне рэжыму дня ў буднія і выхадныя дні.

#### Правілы асабістай гігіены

Догляд за поласцю рота, пазногцямі і валасамі. Прадметы асабістай гігіены. Беражлівыя адносіны да рэчаў. Неабходнасць захавання чысціні адзення і абутку.

#### Харчаванне і здароўе

Ежа, карысная для здароўя. Значэнне ежы для чалавека. Рэжым харчавання. Правілы культурных і бяспечных паводзін за сталом.

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту, параўнанне ўласных адказаў са зместам тэксту. Праца з ілюстрацыямі: апісанне, аналіз, параўнанне; устанаўленне адпаведнасці малюнка з тэкстам. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых вывадаў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і малюнка з існуючым практычным вопытам.

Рашэнне вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроку інфармацыі (ацэньванне або выбар варыянтаў паводзін з пазіцыі захавання і ўмацавання здароўя, прагназіраванне развіцця сітуацыі, фармуляванне правілаў паводзін).

Складанне аповеду аб рэжыме навучэнца з апорай на ілюстрацыі вучэбнага дапаможніка, уласны вопыт.

Вопыт практычнай дзейнасці. Выкананне рэжыму дня. Захаванне правілаў гігіены вучэбнай працы пры выкананні дамашніх заданняў, асабістай гігіены, культуры паводзін за сталом.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА» (3 гадзіны)

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА (3 гадзіны)

### Правы дзіцяці

Правы дзіцяці (права на жыццё, права на ахову і ўмацаванне здароўя, права на пражыванне ў сям’і, права на жыллё, права на імя, права на адукацыю, права на працу, права на адпачынак, права на абарону гонару і годнасці) і яго абавязкі.

### Сям’я

Сям’я. Яе значэнне ў жыцці чалавека. Склад сям’і. Сямейныя традыцыі і сумесны адпачынак як спосабы ўмацавання сям’і. Узаемаадносіны ў сям’і і ўзаемадапамога членаў сям’і. Павага да старэйшых у сям’і. Шанаванне продкаў.

### Эканоміка сям’і

Бюджэт сям’і, яго складнікі (даходы і расходы). Тавары і паслугі. Азбука эканоміі і беражлівасці ў сям’і.

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту. Праца з ілюстрацыямі: апісанне, аналіз, параўнанне; устанаўленне адпаведнасці малюнка з тэкстам. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых высноў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і малюнка з існуючым практычным вопытам. Рашэнне вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроку інфармацыі (ацэньванне або выбар варыянтаў паводзін з пазіцыі маральна-этычных норм, прагназіраванне развіцця сітуацыі, фармуляванне правіл паводзін).

Складанне аповяду аб сям'і з апорай на ілюстрацыі вучэбнага дапаможніка, наяўны вопыт. Складанне аповеду пра цікавыя падзеі ў жыцці сваёй сям'і.

Вопыт практычнай дзейнасці. Складанне схемы «Бюджэт сям'і»; выкананне даручэнняў у сям'і як праяўленне клопату адзін аб адным; захаванне правоў і абавязкаў як члена класнага і школьнага калектыву, грамадзяніна сваёй краіны.

ПАЎТАРЭННЕ (1 гадзіна)

Рэзервовы час – 1 гадзіна.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

адметныя прыкметы аб'ектаў нежывой прыроды і жывых арганізмаў;

уласцівасці паветра і вады, іх значэнне;

крыніцы забруджвання паветра і вады і меры па іх ахове;

склад глебы;

значэнне глебы, яе асноўная ўласцівасць;

мерапрыемствы па павышэнні ўрадлівасці глебы і яе ахове;

разнастайнасць жыццёвых форм раслін (дрэвы, хмызнякі, травяністыя расліны), іх адметныя прыкметы;

назвы частак расліны (корань, сцябло, ліст, кветка, плод);

умовы, неабходныя для росту і развіцця раслін;

назвы найбольш распаўсюджаных дзікарослых і культурных дрэў (не менш за 6), кустоў (не менш за 5), травяністых раслін (не менш за 6); лекавых раслін (не менш за 3), атрутных (не менш за 3); дэкаратыўных (не менш за 3);

назвы раслін Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь (не менш за 3);

назвы ядомых і атрутных грыбоў (не менш за 4);

адметныя прыкметы насякомых, рыб, земнаводных (амфібій), паўзуноў (рэптылій), птушак, млекакормячых (звяроў);

назвы жывёл (насякомыя, рыбы, земнаводныя, паўзуны, птушкі, звяры) (не менш за 3 прадстаўнікі кожнай групы);

групы жывёл па спосабе харчавання (траваедныя, драпежныя, усёедныя) (не менш за 3 прадстаўнікоў кожнай групы);

назвы жывёл Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь (не менш за 4);

правілы прыродаахоўных і бяспечных паводзін на прыродзе;

способы захавання і ўмацавання здароўя чалавека (асабістая гігіена, рэжым працы і адпачынку, фізкультура);

правілы асабістай гігіены;

правілы гігіены вучэбнай працы; важнасць неабходнасці чаргавання працы і адпачынку ў рэжыме дня навучэнцаў;

правілы здаровага харчавання, культурных і бяспечных паводзін за сталом;

прозвішчы, асабовыя імёны і імёны па бацьку (калі такія маюцца) членаў сям'і;

пра бюджэт сям'і і яго складнікі (даходы і расходы);

правы і абавязкі дзяцей у сям'і;

правы дзіцяці (права на жыццё, права на ахову і ўмацаванне здароўя, права на пражыванне ў сям'і, права на жыллё, права на імя, права на адукацыю, права на працу, права на адпачынак, права на абарону гонару і годнасці) і яго абавязкі.

Умець:

адрозніваць аб'екты жывой і нежывой прыроды;

прыводзіць прыклады сувязі паміж аб'ектамі жывой і нежывой прыроды, паміж аб'ектамі жывой прыроды (раслінамі, грыбамі, жывёламі);

праводзіць назіранні за аб'ектамі жывой і нежывой прыроды і расказваць пра свае назіранні;

праводзіць простыя доследы пры вывучэнні ўласцівасцей паветра, вады, глебы, частак раслін; прытрымлівацца інструкцый і правіл тэхнікі бяспекі пры правядзенні доследаў;

тлумачыць умовы, неабходныя для росту і развіцця раслін;

вызначаць прыналежнасць жывёлы да той ці іншай групы на аснове вызначэння істотных прыкмет (падводзіць пад паняцце);

тлумачыць значэнне жывёл у прыродзе і жыцці людзей;

тлумачыць неабходнасць захавання правіл прыродаахоўных і бяспечных паводзін;

тлумачыць неабходнасць выканання рэжыму дня, чаргавання працы і адпачынку, захавання асабістай гігіены, правільнага харчавання;

на аснове жыццёвых назіранняў прыводзіць прыклады праяўлення спагадлівасці, дабрыні, справядлівасці;

тлумачыць неабходнасць захавання правілаў беражлівых адносін да рэчаў і прадметаў, праяўлення паважлівага стаўлення да працы дарослых;

знаходзіць галоўнае ў тэксце, адказваць на пытанні па змесце прачытанага, інтэрпрэтаваць інфармацыю, атрыманую з тэксту, складаць апавяданне на аснове ілюстрацый, аналізаваць малюнкі; выкарыстоўваць

вучэбныя тэксты (мастацкія, навукова-папулярныя), схемы, малюнкі, дадатковую даведачную і навукова-папулярную літаратуру для пошуку неабходнай інфармацыі, інтэграваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц;

выказваць меркаванні, абмяркоўваць праблемныя пытанні, параўноўваць свае выказванні з вучэбным тэкстам;

супрацоўнічаць з аднакласнікамі пры выкананні заданняў у парах і групах (дамаўляцца, размяркоўваць працу, атрымліваць агульны вынік, ацэньваць асабісты ўклад і агульныя вынікі).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

выканання правіл прыродаахоўных паводзін (ахова паветра, вады, глебы, раслін, жывёл);

догляду за пакаёвымі раслінамі;

догляду за свойскімі жывёламі;

усведамлення каштоўнасці прыроды, неабходнасці несці адказнасць за яе захаванне; выканання правілаў паводзін на прыродзе і ўдзелу ў яе ахове;

усвядомленага выканання рэжыму дня, правілаў здаровага харчавання, правілаў паводзін падчас ежы;

захавання правілаў асабістай гігіены (догляду за поласцю рота, пазногцямі, валасамі, захавання ў чысціні адзення і абутку);

эканомных і беражлівых адносін да сямейнага бюджэту.

## ГЛАВА 4
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў ІІІ КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ
(1 гадзіна ў тыдзень, усяго 35 гадзін)

### АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК» (25 гадзін)

### ПЛАНЕТА, НА ЯКОЙ МЫ ЖЫВЕМ (2 гадзіны)

#### Зямля – наш агульны дом

Зямля як планета Сонечнай сістэмы. Выгляд Зямлі з космасу. Глобус – мадэль Зямлі. Паўночны полюс, Паўднёвы полюс. Экватар. Паўночнае і Паўднёвае паўшар'і. Мацярыкі і акіяны на глобусе (назвы і размяшчэнне на глобусе).

### Фізічная карта паўшар’яў

Карта – крыніца атрымання інфармацыі аб навакольным свеце. Адрозненні глобуса і фізічнай карты паўшар’яў. Мацярыкі, акіяны, экватар, Паўднёвы і Паўночны полюсы на фізічнай карце паўшар’яў. Беларусь на глобусе і фізічнай карце паўшар’яў.

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту. Праца з ілюстрацыямі: аналіз, параўнанне; устанаўленне адпаведнасці малюнка з тэкстам. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых вывадаў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і малюнка. Рашэнне вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроку інфармацыі.

Вопыт практычнай дзейнасці. Практычная работа з глобусам і фізічнай картай паўшар’яў: знаходжанне на глобусе і фізічнай карце паўшар’яў мацярыкоў, акіянаў, Паўночнага полюса, Паўднёвага полюса, экватара; абазначэнне на малюнку-схеме Паўночнага полюса, Паўднёвага полюса, экватара.

## АРЫЕНТАВАННЕ НА МЯСЦОВАСЦІ (3 гадзіны)

### Гарызонт. Бакі гарызонту

Гарызонт. Лінія гарызонту. Асноўныя і прамежкавыя бакі гарызонту.

### Арыентаванне на мясцовасці па компасе

Компас, яго прызначэнне, прыстасаванне. Вызначэнне бакоў гарызонту па компасе.

### Арыентаванне па Сонцы і мясцовых прыродных прыкметах

Вызначэнне бакоў гарызонту па Сонцы. Мясцовыя прыродныя прыметы для арыентавання.

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту. Праца з ілюстрацыямі: апісанне, аналіз, параўнанне; устанаўленне адпаведнасці малюнка з тэкстам. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых вывадаў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і

малюнка. Рашэнне вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроку інфармацыі.

Складанне аповеду аб тым, як можна па аб’ектах прыроды вызначыць бакі гарызонту, з апорай на ілюстрацыі і тэкст вучэбнага дапаможніка.

Вопыт практычнай дзейнасці. Засваенне спосабаў арыентавання на мясцовасці па компасе, Сонцы і мясцовых прыродных прыкметах, вызначэнне бакоў гарызонту па компасе і мясцовых прыкметах.

## МОЙ РОДНЫ КРАЙ (15 гадзін)

### Формы зямной паверхні

Раўніны і горы як асноўныя формы паверхні Зямлі. Груд, гара. Іх падабенства і адрозненне.

### Раўнінная паверхня тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і яе значэнне

Раўніны, нізіны, узвышшы на фізічнай карце Беларусі. Значэнне раўніннай паверхні для нашай краіны.

### Карысныя выкапні

Пясок і гліна – найбольш распаўсюджаныя карысныя выкапні. Іх уласцівасці і значэнне ў жыцці чалавека.

### Выкарыстанне і ахова карысных выкапняў

Радовішчы карысных выкапняў на фізічнай карце Беларусі. Выкарыстанне карысных выкапняў. Ахова карысных выкапняў.

### Прыродныя супольнасці Беларусі. Лес і яго насельнікі

Асноўныя прыродныя супольнасці. Лес як прыродная супольнасць. Расліны і жывёлы лесу. Прыстасаванне жывых арганізмаў да ўмоў пасялення. Узаемасувязі паміж раслінамі і жывёламі лесу.

### Лясныя багацці Беларусі

Роля лесу ў прыродзе і яго значэнне для жыцця чалавека. Прыродаахоўная дзейнасць чалавека.

### Вадаём і яго насельнікі

Расліны і жывёлы прэсных вадаёмаў. Прыстасаванне жывых арганізмаў да ўмоў пасялення. Узаемасувязі паміж раслінамі і жывёламі вадаёмаў.

### Водныя багацці Рэспублікі Беларусь

Натуральныя і штучныя вадаёмы. Рэкі і азёры. Адметныя прыкметы рэк і азёр. Часткі ракі. Буйнейшыя рэкі і азёры на фізічнай карце Беларусі. Выкарыстанне вадаёмаў у гаспадарчай дзейнасці людзей. Ахова вадаёмаў ад забруджвання.

### Балота і яго насельнікі

Расліны і жывёлы балот. Прыстасаванне жывых арганізмаў да ўмоў пасялення. Узаемасувязі паміж раслінамі і жывёламі балот.

### Значэнне балот

Роля балот у захаванні чысціні паветра, рэдкіх раслін і жывёл, рэк і азёр Беларусі. Балоты – прыродная фабрыка торфу. Уплыў дзейнасці чалавека на прыродную супольнасць балота. Клопат чалавека аб ахове балот.

### Луг і яго насельнікі

Расліны і жывёлы лугу. Іх прыстасаванне да ўмоў пасялення. Узаемасувязі паміж раслінамі і жывёламі лугу.

### Значэнне лугоў

Роля лугоў у жыцці раслін і жывёл. Расліны-меданосы і лекавыя расліны лугоў. Кармавыя травы – галоўнае багацце лугоў. Выкарыстанне лугоў у гаспадарчай дзейнасці людзей. Клопат аб захаванні лугоў.

### Ахова прыроды – важная задача дзяржавы

Прыродныя тэрыторыі нашай рэспублікі, якія асабліва ахоўваюцца (запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі). Іх роля ў ахове раслін і жывёл. Запаведнікі і нацыянальныя паркі Рэспублікі Беларусь. Унікальная прырода Нацыянальнага парку «Белавежская пушча».

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту, параўнанне ўласных адказаў са зместам тэксту. Праца з ілюстрацыямі: апісанне, аналіз (вызначэнне адметных прыкмет аб’ектаў, асаблівасцей будовы знешняга выгляду раслін і жывёл і іх тлумачэнне ў сувязі з месцам пражывання,

ладам жыцця і харчавання), параўнанне, класіфікацыя. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых высноў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і малюнка з наяўным пачуццёвым вопытам.

Складанне па прачытаным тэксце пытанняў для аднакласнікаў. Складанне апавяданняў аб выкарыстанні карысных выкапняў, аб значэнні рэк і азёр у жыцці чалавека, аб выкарыстанні балот з апорай на ілюстрацыі і тэкст вучэбнага дапаможніка, пачуццёвы і практычны вопыт. Складанне апавяданняў-загадак аб жывёлах лесу, балот, лугоў.

Рашэнне вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроку інфармацыі (на ацэньванне або выбар варыянтаў паводзін у прыродзе з пазіцыі прыродаахоўных або бяспечных паводзін, прагназаванне развіцця сітуацыі).

Экскурсіі на прыроду (2 гадзіны)[1].

Вопыт практычнай дзейнасці. Знаходжанне на фізічнай карце Беларусі асноўных форм зямной паверхні, буйнейшых рэк і азёр, запаведнікаў і нацыянальных паркаў.

Выяўленне доследным шляхам уласцівасцей карысных выкапняў (пяску і гліны) і іх апісанне. Знаходжанне на фізічнай карце Рэспублікі Беларусь радовішчаў карысных выкапняў.

Распазнанне форм зямной паверхні, прыродных супольнасцей і іх насельнікаў па апісанні, ілюстрацыі. Мадэліраванне форм паверхні, прыродных супольнасцей. Захаванне правіл прыродаахоўных паводзін у прыродных супольнасцях.

Распазнанне і апісанне (вусна) раслін лесу, балота, лугу з выкарыстаннем гербарных узораў і малюнкаў.

## РАЗНАСТАЙНАСЦЬ РАСЛІН І ЖЫВЁЛ НА ЗЯМЛІ (5 гадзін)

### Багацце прыроды Зямлі

Разнастайнасць прыроды на Зямлі. Залежнасць разнастайнасці расліннага і жывёльнага свету ад наяўнасці цяпла і вільгаці.

---

[2] Тэмы экскурсій педагагічны работнік выбірае самастойна з улікам магчымасцей рэгіёна.

Расліны – насельнікі сушы

Уплыў цяпла і вільгаці на разнастайнасць раслін зямнога шара. Расліны цеплалюбівыя і холадаўстойлівыя, засухаўстойлівыя і вільгацелюбівыя, святлолюбівыя і ценевынослівыя.

Расліны – насельнікі мораў і акіянаў

Разнастайнасць раслін у морах і акіянах. Іх прыстасаванні да ўмоў жыцця. Роля марскіх водарасляў ў прыродзе і іх значэнне ў жыцці чалавека.

Жывёлы – насельнікі сушы

Разнастайнасць жывёл на Зямлі. Іх прыстасаванні да ўмоў жыцця.

Жывёлы мораў і акіянаў

Марскія рыбы. Іх прыстасаванні да жыцця ў водным асяроддзі. Млекакормячыя, якія жывуць у морах і акіянах. Іх прыстасаванні да воднага асяроддзя пасялення.

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту, параўнанне ўласных адказаў са зместам тэксту. Праца з ілюстрацыямі: апісанне, аналіз (вызначэнне асаблівасцей будовы знешняга выгляду раслін і жывёл і іх тлумачэнне ў сувязі з месцам пражывання, ладам жыцця, спосабам харчавання), параўнанне, класіфікацыя. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых высноў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і малюнка з наяўным пачуццёвым вопытам.

Складанне пытанняў па прачытаным тэксце. Апісанне па вонкавым выглядзе засухаўстойлівых і вільгацелюбівых раслін. Складанне апаведаў-загадак пра жывёл мораў і акіянаў.

Вопыт практычнай дзейнасці. Знаходжанне на фізічнай карце паўшар'яў акіянаў Зямлі. Пазнаванне і вызначэнне адметных прыкмет некалькіх відаў раслін і жывёл розных месцаў зямнога шара.

# АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ» (10 гадзін)

## ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ (10 гадзін)

### Чалавек – частка жывой прыроды

Падабенства чалавека і іншых жывых арганізмаў. Адрозненне чалавека ад іншых жывых істот. Арганізм чалавека як адзінае цэлае. Органы і сістэмы органаў чалавека.

### Скура чалавека

Скура чалавека. Значэнне скуры для арганізма чалавека. Гігіена скуры.

### Апора цела і рух чалавека

Шкілет і мышцы. Іх значэнне для забеспячэння апоры і руху арганізма. Значэнне фізічнай працы і фізкультуры для развіцця шкілета і ўмацавання мышц. Правільная пастава. Яе значэнне для здароўя чалавека. Захаванне правільнай пастава. Уважлівыя адносіны да людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

### Кровазварот чалавека

Органы кровазвароту – сэрца і крывяносныя сасуды. Пульс. Значэнне органаў кровазвароту. Значэнне руху ва ўмацаванні сэрца.

### Дыханне чалавека

Органы дыхання, іх значэнне. Гігіена дыхання, папярэджанне прастудных захворванняў. Значэнне чыстага паветра для здароўя чалавека. Шкода курэння для здароўя чалавека.

### Органы стрававання і выдзялення чалавека

Органы стрававання, іх значэнне. Органы выдзялення. Роля нырак у ачыстцы арганізма чалавека. Правілы здаровага харчавання. Іх значэнне ў захаванні і ўмацаванні здароўя чалавека. Уздзеянне алкаголю на здароўе чалавека.

### Нервовая сістэма чалавека

Галаўны мозг. Спінны мозг. Нервы. Значэнне нервовай сістэмы для арганізма чалавека. Гігіена нервовай сістэмы.

### Органы пачуццяў чалавека

Органы пачуццяў (зрок, слых, нюх, смак, дотык). Вока – орган зроку. Значэнне зроку для чалавека. Гігіена зроку. Правілы прагляду тэлеперадач і працы на камп'ютары. Аказанне дапамогі, падтрымкі людзям з аслабленым зрокам. Уважлівыя адносіны да людзей з аслабленым зрокам.

### Органы слыху, нюху, дотыку, густу чалавека

Вуха – орган слыху. Догляд вушэй. Слых і глухата. Уважлівае стаўленне да людзей з аслабленым слыхам. Органы нюху, дотыку, густу. Іх значэнне і гігіена.

### Правілы здаровага ладу жыцця (абагульняючы ўрок)

Асноўныя віды дзейнасці. Праца з тэкстам: чытанне тэксту, вылучэнне ў ім галоўнага, адказы на пытанні да тэксту, параўнанне ўласных адказаў са зместам тэксту. Праца з ілюстрацыямі: апісанне, аналіз, параўнанне; устанаўленне адпаведнасці малюнка з тэкстам. Адказы на дадатковыя пытанні да тэксту, якія прадугледжваюць фармуляванне прамых вывадаў, інтэрпрэтацыю падтэкставай інфармацыі, інтэграцыю (звязванне) інфармацыі з тэксту і малюнка з існуючым пачуццёвым і практычным вопытам. Рашэнне вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроку інфармацыі (на ацэнку і выбар варыянта паводзін з пазіцыі бяспекі, умацавання здароўя, прагназіраванне развіцця сітуацыі, устанаўленне прычынна-выніковых сувязей).

Складанне аповеду аб тым, што неабходна рабіць для трэніроўкі сэрца, для захавання здароўя органаў дыхання, органаў зроку, з апорай на ілюстрацыі, тэкст вучэбнага дапаможніка, уласны вопыт.

Складанне пытанняў па прачытаным тэксце.

Вопыт практычнай дзейнасці. Захаванне правільнай паставы. Выбар прадуктаў харчавання. Умацаванне нервовай і сардэчна-сасудзістай сістэм.

Клопат аб чысціні скуры; захаванні зроку і слыху.

Разгляданне скуры на руцэ. Прамацванне касцей і мышцаў пад скурай на галаве, грудзях, нагах. Знаходжанне пульсуючага крывяноснага сасуда на запясці і падлік колькасці ўдараў пульса ў хвіліну ў стане спакою і пасля рухальнай актыўнасці. Устанаўленне колькасці дыхальных рухаў у хвіліну ў стане спакою і пасля фізічнай нагрузкі.

Апазнаванне прадметаў з дапамогай органаў нюху, густу і дотыку.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

назвы мацярыкоў і акіянаў;

асноўныя бакі гарызонту;

розныя спосабы арыентавання на мясцовасці;

асноўныя формы зямной паверхні Рэспублікі Беларусь;

адметныя прыкметы ракі і азёры;

найбольш распаўсюджаныя карысныя выкапні Рэспублікі Беларусь (пясок, гліна, торф, нафта, калійная і каменная солі);

характэрныя асаблівасці асноўных прыродных супольнасцей роднага краю (лес, вадаём, балота, луг);

асноўныя органы і сістэмы органаў арганізма чалавека;

асноўныя правілы здаровага ладу жыцця (ахова зроку і слыху, захаванне здаровай нервовай сістэмы, выпрацоўка і захаванне правільнай паставы, умацаванне сэрца, гігіена дыхання, здаровага харчавання, догляд скуры);

пра шкоду курэння і алкаголю для арганізма чалавека.

Умець:

паказваць на глобусе, фізічнай карце паўшар'яў мацерыкі і акіяны;

паказваць на фізічнай карце Рэспублікі Беларусь важнейшыя рэкі і азёры, буйнейшыя нізіны, раўніны, узвышшы, радовішчы карысных выкапняў, запаведнікі і нацыянальныя паркі;

ацэньваць свае паводзіны і ўчынкі іншых людзей у адносінах да прыроды на аснове маральных і прыродаахоўных норм;

ацэньваць свае паводзіны і ўчынкі іншых людзей у адносінах да навакольных людзей на аснове гуманістычных каштоўнасцей і маральных норм;

адрозніваць некалькі відаў найбольш распаўсюджаных раслін і жывёл Беларусі: расліны і жывёлы лесу (не менш за 6), расліны і жывёлы вадаёма (не менш за 4), расліны і жывёлы балота (не менш за 4), расліны і жывёлы лугу (не менш за 4);

тлумачыць узаемасувязі раслін і жывёл у прыроднай супольнасці (лес, вадаём, балота, луг);

тлумачыць featurerознабаковае значэнне прыроды для чалавека, уплыў дзейнасці людзей на прыроду;

тлумачыць асаблівасці прыстасавання раслін і жывёл лесу, вадаёма, балота, лугу да ўмоў пражывання;

тлумачыць неабходнасць выканання правілаў прыродаахоўных паводзін у прыродных супольнасцях і ўдзелу ў ажыццяўленні пасільнай прыродаахоўнай дзейнасці;

тлумачыць неабходнасць захавання правілаў і норм здаровага ладу жыцця;

знаходзіць галоўнае ў тэксце, адказваць на пытанні па змесце прачытанага, інтэрпрэтаваць інфармацыю, атрыманую з тэксту, складаць апавяданне на аснове ілюстрацый, аналізаваць малюнкі; выкарыстоўваць вучэбныя тэксты (мастацкія, навукова-папулярныя), геаграфічныя карты, табліцы, дыяграмы, схемы, малюнкі, дадатковую даведачную і навукова-папулярную літаратуру;

выкарыстоўваць для ўдакладнення і пашырэння сваіх ведаў аб навакольным свеце энцыклапедыі, глабальную камп’ютарную сетку Інтэрнэт (ва ўмовах кантраляванага ўваходу);

інтэграваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц;

арыентавацца ў тэксце вучэбнага дапаможніка і знаходзіць адказы на пастаўленыя пытанні;

выказваць меркаванні, абмяркоўваць праблемныя пытанні, параўноўваць свае выказванні з вучэбным тэкстам;

супрацоўнічаць з аднакласнікамі пры выкананні заданняў у парах і групах (прытрымлівацца агульных мэт, планаваць сумесную работу або прытрымлівацца інструкцый, размяркоўваць работу і абавязкі, дамаўляцца, аналізаваць і ацэньваць асабісты ўклад, агульныя вынікі работы).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

арыентавання на мясцовасці;

распазнавання і апісання раслін і жывёл бліжэйшага прыроднага наваколля;

выкання правілаў прыродаахоўных паводзін і прыродаахоўнай дзейнасці;

выкання правілаў захавання і ўмацавання здароўя; заняткаў фізкультурай і спортам;

выкання маральна-этычных норм ва ўзаемадзеянні з навакольнымі людзьмі, выканання абавязкаў грамадзяніна сваёй краіны (беражлівыя адносіны да прыродных багаццяў, выкананне правілаў прыродаахоўных паводзін, клопат аб сваім здароўі).